УДК 930 (476)+357.71

***І. І. Шаўчук***
*д-р гіст. навук, дац. дац. каф. усеагульнай гісторыі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
e-mail: genhist@brsu.brest.by

# СТАТУТЫ ІНБЕЛКУЛЬТА: ВЫТОКІ СУЧАСНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ

*Прадстаўлены вынікі гістарыяграфічнага вывучэння аднаго з фрагментаў гісторыі Інстытута беларускай культуры (ІБК) – нарматыўнага афармлення яго дзейнасці, адлюстраванага ў статутах. Даследуецца працэс стварэння першага статута ІБК у 1921 г. Выяўлена адсутнасць увагі да гэтай праблемы ў айчыннай гістарычнай навуцы. Устаноўлены вытокі аднастайнай эпізадычнай канстатацыі зазначанай праблемы – намінальныя згадкі пра яе ў літаратуры міжваеннага перыяду. Зроблена выснова пра некарэктнасць заключэнняў аўтараў адносна часу арганізацыі стварэння і аўтарства першага статуту (пачатак 1921, 1922 гг., У. І. Пічэта, выкладчыкі БДУ, шматлікія камісіі), пра адсутнасць аргументацыі падобных высноў. Зроблена спроба рэканструкцыі рэальных падзей таго часу.*

Гісторыю стварэння асобнага навукова-даследчага комплексу навуковага патэнцыялу Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі слушна пачынаюць адлічваць ад стварэння Інстытута беларускай культуры (ІБК), гэта значыць ад часу паўторнай інстытуалізацыі навукі на пачатку XX ст. У артыкуле выдзелены толькі адзін аспект з усёй іх сукупнасці, што тычыцца гісторыі вывучэння стварэння і дзейнасці Інстытута. Адпаведна ўвага будзе звернута на асвятленне ў навуцы гісторыі статутнага афармлення функцыянавання ўстановы і, перад усім яе першага статута. Дадзеная праблема не атрымала ні гістарычнага, ні гістарыяграфічнага вывучэння. Таму папярэдзіць асноўны тэкст гістарыяграфічным аналізам зробленага не ўяўляецца магчымым.

Неабходна зазначыць, што ўзнятая тэма, дакладней першы статут, згадваецца ў вялікай колькасці навуковых публікацый, трапіла ў навучальныя выданні, выкарыстоўваецца ў папулярных публікацыях, але выключна намінальна, без верыфікацыі выніковых канстатацый. Нават навуковыя працы грунтуюцца толькі на канспектыўных эпізадычных згадках тэкстаў 1920-х гг.

Дзеля таго каб выразна прадэманстраваць развіццё думкі па акрэсленай праблеме, згрупуем асноўныя пазіцыі паводле прозвішчаў членаў камісій (па арганізацыі ІБК, напісанні статута), як яны прадстаўлены ў спецыяльных публікацыях. Такі падыход паспрыяе высвятленню і разуменню каранёў сённяшніх, быццам бы бясспрэчных, канстатацый. Зыходзячы са сказанага, можна выдзеліць наступныя групы:

***І. З. Х. Жылуновіч, У. І. Пічэта.***

*С. Н[екрашэвіч] (1922)* [тут і далей курсіў наш. – *І. Ш.*]: «Была выбрана камісія для распрацавання статуту ІБК. Апрацаваны гэтай камісіяй пад старшынствам З. Жылуновіча праект статуту ІБК адводзіў толькі шырокае месца культурна-грамадзянскім пытанням, надаючы, такім чынам, Інстытуту характар больш грамадзянскай, чымся навукова-даследчай установы. Адначасна *праўленне БДУ ў асобе рэктара* Пічэты апрацавала статут ІБК па тыпу даследчых інстытутаў» [1, с. 279].

*Г. Няміга (1957)*: «У студзені 1921 г. нарада выбрала камісію па апрацаванні статуту Інбелкульту. Апрацаваны камісіяй пад старшынствам З. Жылуновіча праект статуту Інбелкульту адводзіў толькі шырокае месца культурна-грамадзянскім пытанням, надаючы... Інстытуту характар больш грамадскай, чымся навукова-даследавальнай

установы. Побач... будучы рэктар Бел. Дзярж. Універсітэту праф. У. Пічэта ў Маскве апрацоўвае праект статуту Інбелкульту па тыпу даследавальных інстытутаў» [2, с. 15].

*Інстытут беларускай культуры (1993)*: «Была створана камісія па выпрацоўцы статута Інстытута беларускай культуры пад старшынствам З. Х. Жылуновіча. Праект статута, які выпрацавала камісія, надаваў інстытуту характар навукова-даследчай і грамадска-культурнай установы. Адначасова *праўленнем* Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам У. І. Пічэты быў падрыхтаваны праект статута Інбелкульта па тыпу даследчых інстытутаў» [3, с. 7].

Такім чынам, прыведзеныя выказванні ілюструюць вытокі меркаванняў пазнейшых аўтараў – тэкст С. М. Некрашэвіча.

***ІІ. Я. Л. Дыла, З. Х. Жылуновіч, Я. Ф. Карскі, У. І. Пічэта.***

*Э. Р. Іофе (1972)*: актыўна ўдзельнічалі ў распрацоўцы Статута Інбелкульта У. Пічэта, Я. Дыла, Я. Карскі, З. Жылуновіч [4, с. 205].

*У. М. Міхнюк (1979)*: «Да лістапада таго ж года камісія *па стварэнню* Інстытута беларускай культуры, у якую ўваходзілі У. Пічэта, Я. Дыла, Я. Карскі і Д. Жылуновіч, закончыла распрацоўку статута інстытута, вызначыла яго структуру і характар дзейнасці» [5, с. 21].

*Беларусь. Энцыклапедычны даведнік (1995)*: «У распрацоўцы першага статута прымалі ўдзел Я. Л. Дыла, З. Х. Жылуновіч (старшыня камісіі), Я. Ф. Карскі, У. І. Пічэта» [6].

*ЭГБ (1996)*: «У стварэнні ІБК і падрыхтоўцы яго першага статута ўдзельнічалі Я. Л. Дыла, З. Ф. Жылуновіч, Я. Ф. Карскі, У. І. Пічэта» [7, с. 490].

З прыведзеных канстатацый адназначна вынікае наяўнасць з канца студзеня сталай камісіі пад старшынствам З. Хв. Жылуновіча, якая распрацавала статут ІБК да лістапада 1921 г. Не спрачаючыся з тым, што ўсе пералічаныя тут чатыры асобы насамрэч у розны час бралі ўдзел у распрацоўцы статута(-аў), зазначым пэўную блытаніну, а значыць, хісткасць прадстаўленай пазіцыі. Старшынства З. Х. Жылуновіча пазначана ў вышэйпрыведзенай публікацыі С. М. Некрашэвіча. Але ні ў ёй, ні ў іншых тэкстах, у тым ліку архіўных, не паказаны асабовы склад гэтай камісіі. Прозвішчы членаў камісіі ўяўляюць сабой меркаванні. Аднак тое, што гэта менавіта меркаванні, нікім не падкрэсліваецца, а таму выглядае рэканструкцыяй рэальных падзей.

Паколькі да сёння не выяўлена інфармацыі ў даваенных матэрыялах пра паказаную камісію і яе ўдзельнікаў, родапачынальнікам ідэі можна лічыць Э. Р. Іофе. Нягледзячы на чатыры прыведзеныя пазіцыі ў розных выданнях, яны належаць двум аўтарам, паколькі непадпісаны артыкул у «Беларускай энцыклапедыі», думаецца, створаны на базе ранейшага тэкста У. М. Міхнюка. Ён, як і ў папярэдняй групе Г. Няміга, спасылаецца на часопіс «Асьвета» (1924, № 2). Але ні ў адным артыкуле нумара, прысвечанага ІБК, такой інфармацыі няма. У. М. Міхнюк у дадатак спаслаўся на кнігу «Інстытут Беларускае Культуры» (1926). Але і там гэтага няма, што вынікае са складу наступнай трэцяй групы.

*А. В. Баранава (2009)*: «У пачатку 1921 г. у час працы Маскоўскай камісіі па арганізацыі Беларускага універсітэта *група прафесараў пад яго [Пічэты] старшынствам* у схему БДУ ўключыла і інстытут беларускай і яўрэйскай культур, быў распрацаваны праект яго статута па тыпу навукова-даследчых інстытутаў. Адначасова статут Інбелкульта распрацоўваўся ў Мінску спецыяльнай камісіяй пры Наркамаце асветы пад старшынствам Д. Ф. Жылуновіча, згодна яму Інбелкульт арганізоўваўся як грамадская арганізацыя... Над статутам інстытута, акрамя Пічэты, актыўна працавалі Я. Л. Дыла

(ад Наркамата асветы ССРБ) і акадэмік Я. Ф. Карскі, знаходзячыся ў Ленінградзе. *У выніку прынятага рашэння аб аб'яднанні ўсіх трох азначаных праектаў* статут Інбелкульта быў распрацаваны і прыняты, як мяркуецца, у лістападзе 1921 г.» [8, с. 78, 79].

А. В. Баранава інтрыгуе больш за ўсіх. У яе варыянце працуюць дзве камісіі: У. І. Пічэты і З. Х. Жылуновіча, а таксама два «індывідуалы» – Я. Ф. Карскі і Я. Л. Дыла. Але аб'ядноўваюцца «тры азначаныя праекты». Загадка. Але вырашаць яе не станем, таму што ўсё сказанае – бяздоказныя фантазіі.

***III. Я. Л. Дыла, Я. Ф. Карскі, У. І. Пічэта.***

*А. І. Цвікевіч (1926)*: «Усе адчувалі, што ў форме Камісіі... развіццё беларускай культуры не можа адбывацца нармальна. У звязку з гэтым рад асоб заняўся апрацаваннем статуту будучага Інстытуту: Пічэта ў Маскве, Дыла ў Мінску, Карскі ў Ленінградзе. Гэтыя праекты адбівалі, кожны па свойму, цэнтральнае разыходжанне, якое зазначылася яшчэ на сходзе 27 студзеня [1921 г.]. Урэшце праект Пічэты, Карскага і Дылы сумесна ўзгадніў гэтыя два прынцыпы і ІБК быў заснаваны як установа навукова-даследчая і, разам з тым, як установа культурна-грамадзянская» [9, с. 10]. Складальнік кнігі крышталізаваў часопісны (1922 г.) тэкст С. М. Некрашэвіча, фактычна сцвярджаючы пра тры праекты (камісіі) статута. І менавіта ў такой форме ідэя набыла папулярнасць у некаторых пасляваенных даследчыкаў пасля іх уласнай дапрацоўкі.

*І. Ф. Шпілеўскі, Л. А. Бабровіч (1933)*: «Нацыянал-дэмакраты – заснавальнікі тэрміналагічнай камісіі... ужо ў 1922 г. паднялі пытанне аб арганізацыі Інстытута, прапанаваўшы... заўзятым вялікадзяржаўнікам, як Пічэта і Я. Дыла і нават манархістам – акадэміку Карскаму – распрацаваць адпаведны статут будучага Інстытута Беларускай Культуры» [10, с. 3–4].

*У. А. Палуян (1972)*: «Неўзабаве вядомыя вучоныя Пічэта, Карскі, Дыла падрыхтавалі праект *утварэння* Інстытута беларускай культуры» [11, с. 104]. Такім чынам, тут аўтар прапануе не толькі склад камісіі па напісанні статута, а, перад усім, склад камісіі па арганізацыі Інбелкульта. Што канкрэтна мелася на ўвазе, сказаць цяжка, паколькі думка, сфармуляваная ў дадзеным двухрадковым абзацы, працягу не мае.

*В. К. Бандарчык (1972, 1999)*: «У гэтым жа годзе было ўзнята пытанне аб рэарганізацыі камісіі [НТК] у інстытут. Карскі, Пічэта, Дыла распрацавалі статут і ў пачатку 1922 г. быў створаны Інстытут беларускай культуры» [12, с. 16–17; 13, с. 261].

*Акадэмія навук БССР (1979)*: «У распрацоўцы яго (ІБК) статута ўзялі ўдзел выбітны вучоны філолаг і этнограф Я. Ф. Карскі, вядомы гісторык У. І. Пічэта, мастацтвазнаўца Я. Л. Дыла» [14, с. 14].

*Э. Р. Іофе (1981)*: «Вялікую ролю адыграў У. І. Пічэта ў арганізацыі Інстытута беларускай культуры. Разам з акадэмікам Я. Ф. Карскім і мастацтвазнаўцам Я. Л. Дылам ён распрацаваў яго статут» [15, с. 36]. У дадзеным варыянце сцвярджаецца пра камісію, якая агульнымі намаганнямі стварыла адзін статут.

*А. А. Яноўскі, А. В. Баранава (2008)*: «Яго [У. І. Пічэты] праекту ў пачатку 20-х гг. быў *супрацьпастаўлены* праект беларускіх навуковых і культурных дзеячаў, якія імкнуліся стварыць Інстытут беларускай культуры ў якасці асобнай установы. Над статутам інстытута акрамя Пічэты актыўна працавалі Я. Л. Дыла ад Наркамасветы Беларусі і акадэмік Я. Ф. Карскі ў Ленінградзе. *У выніку прынятага рашэння аб аб'яднанні ўсіх трох праектаў*, статут Інбелкульта быў распрацаваны і прыняты, як мяркуецца, у лістападзе 1921 г.» [16, с. 227].

*А. А. Яноўскі (2017)*: «У пачатку 1921 г., падчас працы Маскоўскай камісіі па арганізацыі БДУ група прафесараў пад яго [Пічэты] старшынствам у схему БДУ

ўключыла і Інстытут беларускай і яўрэйскай культур, быў распрацаваны праект яго статута па тыпу навукова-даследчых інстытутаў... Яго [У. І. Пічэты] праекту быў *супрацьпастаўлены* праект беларускіх навуковых і культурных дзеячаў, якія імкнуліся стварыць Інстытут беларускай культуры ў якасці самастойнай установы. У. І. Пічэта актыўна ўключыўся ў напісанне статута *такога* [самастойнага] інстытута (разам з прадстаўніком Наркамасветы Я. Л. Дылам і акадэмікам Я. Ф. Карскім). У выніку аб’яднання ўсіх трох праектаў статут Інбелкульта быў распрацаваны і прыняты восенню 1921 г.» [17, с. 35–36].

Погляды, прадстаўленыя ў гэтай групе, цалкам грунтуюцца на схематычным выказванні А. І. Цвікевіча, якое атрымала пазнейшую папулярнасць і развіццё. Звернем увагу, А. І. Цвікевіч піша пра *шэраг асоб*, якія заняліся распрацоўкай статута, і далейшае *ўзгадненне імі* сваіх пазіцый. З 1972 г. гэты шэраг асоб са сваімі прапановамі фактычна пераўтвараецца ў зладжаную каманду (камісію). У 2000-х гг. адбываецца вяртанне да сцвярджэння пра пагадненне *трох праектаў*. Адкуль яны ўзяліся, з адпаведных тэкстаў не зразумела, паколькі з друку 1920-х гг. такая выснова не вынікае. Адначасова А. А. Яноўскі і А. В. Баранава ўводзяць пэўныя навіны ў карціну стварэння статута. Канцэнтравана іх думка выглядае наступным чынам: група маскоўскіх прафесараў на чале з У. І. Пічэтам (альбо Пічэта самастойна – іх супольны артыкул 2008 г.) падчас арганізацыі БДУ стварыла праект статута, а пазней яму быў *супрацьпастаўлены* праект беларускіх навуковых і культурных дзеячаў. Заўважым таксама, што ніводная публікацыя 1920-х гг., як і архіўныя матэрыялы, не згадвае пра супрацьпастаўленне праектаў статутаў. Бянтэжыць яшчэ адна ідэя А. А. Яноўскага ў артыкуле 2011 г. і кнізе 2017 г. выдання. Вышэй працытаваны ўрывак з кнігі. Прывядзем цытату з ранейшага артыкула: «Але рэктар [Пічэта] быў адным з распрацоўшчыкаў Статута Інбелкульта як *асобнай* навуковай установы, а пазней актыўным прыхільнікам стварэння на яго базе Беларускай акадэміі навук» [18, с. 55]. Гэта супярэчыць усім вядомым даным, нават іншым выказванням самога аўтара. А таму зрабіць нейкія навуковыя высновы з прычыны скажэння рэальнай агульнавядомай сітуацыі наўрад ці магчыма.

Нельга прамінуць увагай змену пазіцый Э. Р. Іофе на працягу амаль пяцідзесяці гадоў. Так, у 1970 г. ён толькі зазначыў: «У. Пічэта прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі і дзейнасці Інстытута беларускай культуры» [19, с. 220]. У 1971 г. тэма «Пічэта і ІБК» ім праігнаравалася [20]. Аналагічная пазіцыя прадэманстраваная ў 2000 г. Яго аб’ёмісты артыкул у расійскім выданні (15 старонак, 1,6 д. а.) не ўтрымлівае ні слова пра ролю У. І. Пічэты ў гісторыі Інбелкульта [21]. Але на канферэнцыі, прысвечанай Інбелкульту (2017) нават назва даклада Эмануіла Рыгоравіча была сфармулявана наступным чынам: «Удзел У. І. Пічэты ў *стварэнні* і дзейнасці Інстытута беларускай культуры» [22]. Ітак, развіццё поглядаў Э. Р. Іофе прайшло шлях ад ігнаравання пытання аб актыўным ўдзеле да ледзь не прыярытэтнай ролі У. І. Пічэты ў стварэнні ІБК і напісанні яго першага статута (нягледзячы на разавае адступленне на старыя пазіцыі замоўчвання ў 2000 г.). Як бачым, на гэтым шляху здараліся хістанні канцэптуальнага характару. Праўда, усе версіі, як і выкрэсліванне са спісу стваральнікаў статута З. Х. Жылуновіча, пакінутыя без тлумачэнняў і аргументацыі.

Мусім згадаць яшчэ адзін момант. А. В. Баранава і А. А. Яноўскі ў працытаваных творах 2008, 2009 і 2017 гг. пішуць пра прыняцце (зацвярджэнне) статута ў лістападзе 1921 г. У 2008 г. імі зроблена спасылка на кнігу А. І. Цвікевіча «Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт). Гісторыя ўзьнікненьня. Сучасная структура. Навукова-дасьледчая дзейнасьць» (1926, с. 11). А. В. Баранава ў кандыдацкай дысертацыі пайшла ўдаскана-

леным шляхам. У адрозненне ад артыкула ў суаўтарстве з А. А. Яноўскім (2008), яна пашырыла дыяпазон спасылак, павялічыўшы колькасць старонак першай спасылкі (с. 9–11), дадаўшы да кнігі А. І. Цвікевіча калектыўную манаграфію «Наука Беларуси в XX столетии» (2001, с. 6).

Але таго, хто захоча знайсці падобную інфармацыю ў зазначаных выданнях, чакае расчараванне. Ні на указаных старонках, ні ўвогуле ў прыведзеных кнігах такой думкі не фіксуецца. У сваю чаргу, суаўтары не прадставілі ніякіх доказаў пасля памянёнай фразы. Упершыню ж падобнае меркаванне змешчана ў часопіснай публікацыі: «У лістападзе-снежні [1921 г.] ІБК атрымаў зацверджаны статут» [23, с. 28]. Дадзеная думка ў крыху скарэктаваным выглядзе прысутнічае ў наступным артыкуле: «Не пазней, чым у лістападзе [1921 г.], ІБК атрымаў зацверджаны статут» [24, с. 18] і манаграфіі: «Мы можам, як падаецца, канстатаваць... атрыманне ім [ІБК] у лістападзе зацверджанага палажэння (статута)» [25, с. 21]. Такім чынам, павярхоўнае знаёмства А. В. Баранавай і А. А. Яноўскага з праблемай, якая асвятляецца, некарэктныя запазычванні чужых меркаванняў не дазволілі ім наблізіцца да стварэння праўдападобнай карціны працэсу напісання статута Інбелкульта.

***IV. Я. Л. Дыла, Я. Ф. Карскі, С. М. Некрашэвіч.***

*У. М. Ігнатоўскі (1928)*: «Наркамат Асветы арганізоўваў сходы культурнікаў для абгавору пытання аб арганізацыі Інбелкульту». Адзін з іх прадстаўлены цытатай з газеты «Савецкая Беларусь»: «18 чэрвеня.. пад старшынствам народнага камісара асветы адбылася нарада беларускіх культурных працаўнікоў сумесна з прафесарамі Е. Карскім, У. Пічэтам і Х. Туруком па пытанні аб Інстытуце Беларускай Культуры, які мае незабавам адчыніцца ў Менску... Для канчатковага апрацавання статуту нарада выбрала з сябе камісію з трох чалавек праф. акадэміка Карскага, Я. Дыла і С. Некрашэвіча» [26, с. 11]. Дадзены вынік можна разглядаць як лагічны працяг рашэння Навукова-літаратурнай калегіі НКА, якая на паседжанні 1 чэрвеня 1921 г. пастанавіла: «Пацвердзіць папярэднюю пастанову аб Інстытуце белар. культуры... распрацаваць уставу [ІБК] і падаць яе на зацвярджэнне Камасветы» [27].

*М. У. Токараў (1992)*: у чэрвені 1921 г. для канчатковай выпрацоўкі статута створана камісія: Я. Ф. Карскі, Я. Л. Дыла, С. М. Некрашэвіч [28].

*Інстытут беларускай культуры* (1993): «У чэрвені 1921 г. для *канчатковай* выпрацоўкі статута Інбелкульта была створана камісія ў складзе акадэміка Я. Ф. Карскага, Я. Л. Дылы і С. М. Некрашэвіча. Да лістапада 1921 г. яна распрацавала статут Інбелкульта, які аб'яднаў у сябе абодва прынцыпы развіцця Інстытута – і як навукова-даследчай, і як культурна-грамадскай установы» [3, с. 7–8].

*В. У. Скалабан, М. У. Токараў (2011)*: «У чэрвені 1921 г. для *канчатковай* выпрацоўкі статута была створаная камісія ў складзе акадэміка Расійскай акадэміі навук Я. Ф. Карскага, Я. Л. Дыла і С. М. Некрашэвіча. Да лістапада яна распрацавала статут Інстытута, які аб'яднаў у сабе прынцыпы развіцця інстытута – як навукова-даследчай і культурна-грамадскай установы» [27, с. 4].

*Э. Р. Іофе (2018)*: «У чэрвені 1921 года для *канчатковай* выпрацоўкі статута Інстытута беларускай культуры была створана камісія ў складзе акадэміка Я. Ф. Карскага, Я. Л. Дылы і С. М. Некрашэвіча. Да лістапада 1921 года яна распрацавала статут Інстытута беларускай культуры, які аб'яднаў абодва прынцыпы развіцця ІБК – і як навукова-даследчай, і як культурна-грамадскай установы» [29, с. 5–6].

Сучасныя аўтары, за выключэннем Э. Р. Іофе, які спаслаўся на кнігу 1993 г., па-першае, не паказалі сапраўднай крыніцы сцверджання, якое лагічна ўспрымаецца

ў якасці іх уласнага, хаця і аднастайнага, меркавання. Але, як вынікае, за шмат гадоў да названых даследчыкаў сітуацыя адлюстравана ў артыкуле У. М. Ігнатоўскага. Ён, у адрозненне ад сённяшніх гісторыкаў, паказаў крыніцу – газету «Савецкая Беларусь».

Другое, на што трэба звярнуць увагу, гэта на прысутнасць на чэрвеньскай нарадзе Я. Ф. Карскага, У. І. Пічэты і Ф. Ф. Турука. Усе пасляваенныя даследчыкі, а фактычна можна казаць пра аднаго аўтара – М. У. Токарава, пазнаёміўшыся з артыкулам У. М. Ігнатоўскага на пачатку 1990-х гг., адкуль узятая інфармацыя, упарта не заўважалі гэтых дзвюх асоб. А надарэмна. Як вядома, У. І. Пічэта і Ф. Ф. Турук выступалі за арганізацыю навукова-даследчага інстытута пры Белдзяржуніверсітэце. Вялікае значэнне мае іх актыўная дзейнасць у дадзеным кірунку і ў Маскве, і ў Мінску. Я. Ф. Карскі жа не браў заўважнага ўдзелу ў акрэсленых арганізацыйных працэсах. Жыў у Петраградзе і з'яўляўся своеасаблівым дарадцам праз прыватную перапіску, наколькі сёння вядома, толькі з намеснікам старшыні Акадэмцэнтра С. М. Некрашэвічам. Канкрэтная інфармацыя пра погляды Я. Ф. Карскага на арганізацыйнае становішча ІБК адсутнічае. Але можна меркаваць, ён катэгарычна не выступаў за стварэнне інстытута ў складзе БДУ, таму, хутчэй за ўсё, і апынуўся ў складзе камісіі.

Такім чынам, пасляваенная, і нават сучасная, гістарыяграфія пакідае без увагі факт неўваходжання (неабрання, непрызначэння) у камісію на нарадзе культурных працаўнікоў пад старшынствам Наркама асветы У. М. Ігнатоўскага (18 чэрвеня 1921 г.) У. І. Пічэты і Ф. Ф. Турука, якія бачылі будучыню НДІ па беларусазнаўству выключна ў складзе ўніверсітэта па аналогіі з НДІ пры ФГН Маскоўскага ўніверсітэта. А гэта ж вельмі важны момант арганізацыйнай гісторыі. Ён сведчыць пра тое, што ў чэрвені ў дырэктыўных органах узмацняюцца пазіцыі беларускіх нацыянальных дзеячаў з іх імкненнем стварэння самастойнага НДІ як перадумовы будучай Акадэміі навук. Мусім памятаць, што ўсё гэта адбываецца пасля пастановы 3-й сесіі ЦВК БССР, якая 17 красавіка 1921 г. чарговы раз пастанавіла «ўстанавіць навукова-даследчы інстытут беларускай і яўрэйскай культуры» пры ўніверсітэце [30, с. 43].

Цікава, што У. І. Пічэта, гаворачы ў артыкуле «Савецкая ўлада і пытанне аб адчыненні ўніверсітэту на Беларусі» (1928) пра красавіцкую паездку маскоўскай арганізацыйнай тройкі па стварэнні ўніверсітэта, нічога не згадвае пра ўяўленне ёю мэтаў Інстытута. А яна выразна выказана Ф. Ф. Туруком на сходзе «культурнікаў» 19 красавіка. Напрыклад: «Адначасова з вывучэннем Беларускай мовы будзе адбывацца вывучэнне рускай і ўкраінскай моваў». Не згадаў першы рэктар БДУ ні пра спрэчкі на сходзе, ні пра рашэнне яго ўдзельнікаў «даручыць выпрацоўку плана і праграмы дзейнасці будучага інстытута беларускай культуры беларускім культурным працаўнікам разам з прафесарамі-беларусамі» [31]. Заканчваючы свае нататкі, У. І. Пічэта пераходзіць ад красавіцкай пастановы адразу да ліпеньскага дэкрэта аб адкрыцці БДУ (11.07.1921), не згадваючы пра чэрвеньскую нараду, уласную ролю ў напісанні статута ІБК і пра стварэнне ў складзе ўніверсітэта Інстытута беларускай і яўрэйскай культуры, прадугледжанае гэтым дэкрэтам. Думаецца, першы рэктар БДУ наўмысна абмінуў увагай статутныя калізіі, паколькі ў 1928 г., часе напісання ім тэксту, Інбелкульт насуперак яго, і не толькі, першапачатковым (1921–1922) планам праіснаваў як самастойная ўстанова сем гадоў і падыходзіў да новага этапу свайго развіцця – пераўтварэння ў Акадэмію навук.

Недастатковае асэнсаванне матэрыялаў прывяло некаторых аўтараў да супярэчнай сітуацыі. Гэта дэманструе элементарнае несупастаўленне напісанага ледзь не на адной старонцы. Ілюструючы дадзеную ацэнку, паўтарымся цытаваннем. На пачатку с. 7 «Інстытута беларускай культуры» (1993) сказана пра праект статута камісіі З. Х. Жылуновіча

(студзень 1921 г.), які надаваў Інстытуту «характар *навукова-даследчай і грамадска-культурнай установы*» (гл. вышэй: група I). Праўда, не адзначана, калі завершана гэтая распрацоўка. Напрыканцы с. 7 – пачатку с. 8 гаворыцца пра чэрвеньскую камісію (гл. вышэй: група IV), канчатковы праект якой аб'яднаў у лістападзе два прынцыпы арганізацыі «*і як навуковай, і як культурна-грамадскай установы*». Пытанне, навошта ў такім выпадку спатрэбілася стварэнне камісіі ў чэрвені, калі ўсё было створана студзеньскім калектывам, аўтары, відаць, аднеслі да рытарычных. Таму адказ на яго заканамерна адсутнічае.

Даволі арыгінальнай выглядае гістарыяграфічная навацыя апошніх гадоў. Намаганнямі выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пакладзены пачатак укараненню ў гістарычную свядомасць арыгінальнай, але цалкам фантазійнай канцэпцыі стварэння Інбелкульта і яго першага статута. Для зручнага ўспрыняцця інфармацыі зноў скампануем публікацыі храналагічна і дадаткова выдзелім групу.

***V. У. І. Пічэта, Я. Ф. Карскі.***

*С. М. Ходзін, А. А. Яноўскі (2016)*: «У 1922 годзе стаў дзейнічаць Інстытут беларускай культуры – першая комплексная навуковая ўстанова Беларусі. Яе *статут быў распрацаваны вучонымі БДУ на чале з У. І. Пічэтам і развіты спецыяльнай камісіяй на чале з Я. Ф. Карскім*» [32, с. 18].

*С. У. Абламейка (2017)*: «Універсітэт з'явіўся падмуркам для стварэння і развіцця ў 1922 г. Інстытута беларускай культуры... Яго *статут быў распрацаваны навукоўцамі БДУ на чале з У. І. Пічэтам і развіты спецыяльнай камісіяй на чале з Я. Ф. Карскім*, а першым кіраўніком стаў Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч – універсітэцкі прафесар-філолаг» [33, с. 17].

Першае, што кідаецца ў вочы, гэта тое, што рэктар БДУ С. У. Абламейка без спасылак перапісаў ранейшы тэкст гісторыкаў. Дарэчы, С. М. Ходзін і А. А. Яноўскі пра БДУ як падмурак ІБК сцвярджалі ў тым жа супольным артыкуле [32, с. 16]. Думаецца, С. У. Абламейка быў арыентаваны самімі суаўтарамі. Неверагоднасць прыведзенага відавочна, што яскрава характарызуе ўзровень асэнсавання навуковай праблемы. Гістарычнай навуцы невядома, а ў тэкстах не паясняецца, на чым грунтуецца сцвярджэнне пра распрацоўку статута ІБК навукоўцамі БДУ вясной – восенню 1921 г., калі статут Інстытута распрацаваны да лістапада гэтага года, а рэальная праца ўніверсітэта пачалася з 1 лістапада. Між іншым, тады ж сфарміраваны і першы склад выкладчыкаў. Незразумела, калі не памятаць пра артыкул С. М. Некрашэвіча, адкуль аўтары ўзялі, што У. І. Пічэта ўзначальваў нейкую камісію па распрацоўцы статута. Таксама невядома, адкуль яны даведаліся пра існаванне спецыяльнай камісіі Я. Ф. Карскага, якая «шліфавала» праект. Ніводная канстатацыя не пацверджана дакументальна. Усе яны ахінутыя нейкай заслонай сакрэтнасці альбо трывіяльнасці. Наяўная сукупнасць архіўнага і апублікаванага матэрыялу не дазваляе пагадзіцца з падобнага роду выказваннямі. Нават у дробязях: С. М. Некрашэвіч у 1921–1922 гг. не займаў пасады прафесара ў БДУ, ды увогуле ў акрэслены час у ім не выкладаў. Між іншым, апошняй памылкі можна было б пазбегнуць, пазнаёміўшыся з біябібліяграфічным даведнікам, складзеным А. А. Яноўскім [34].

Завяршым думку наконт знаходак універсітэцкіх вучоных выяўленнем каранёў іх найноўшай мыслі пра гісторыю стварэння статута (па храналогіі з'яўлення ў друку):

1) 1922 г.: праўленне БДУ *ў асобе рэктара У. І. Пічэты* апрацавала статут ІБК;
2) 1957 г.: прафесар *У. Пічэта* ў Маскве апрацаваў праект статуту Інбелкульту;

3) 1993 г.: праўленне БДУ *пад кіраўніцтвам У. І. Пічэты* падрыхтавала праект статута;

4) 2009, 2017 гг.: *група прафесараў пад старшынствам У. І. Пічэты* распрацавала праект статута ў час працы маскоўскай камісіі па арганізацыі БДУ;

5) 2016, 2017 гг.: *навукоўцы БДУ на чале з У. І. Пічэтам* распрацавалі статут.

Нават у сістэматызаваных намі выказваннях стваральнікі новай канцэпцыі не бачаць супярэчнасці. Вынікае, меркаванні, выказаныя зазначанымі выкладчыкамі БДУ як навуковую пазіцыю ўспрымаць нельга. Між тым, А. А. Яноўскі і іншыя зусім ігнаруюць вядомае ім выказванне Ф. Ф. Турука: «У схему Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў уключаны навукова-даследчы інстытут беларускай і яўрэйскай культур... *праект статута якога пасля зазнаў перапрацоўку* ў Наркамасвеце С.С.Р. Беларусі» [35, с. 199].

Такім чынам, і ўніверсітэцкія аўтары, і іншыя недастаткова дбайна прапрацавалі шэраг праблем, якія яны імкнуліся разгледзець. Адсюль, бачачы канспектыўнасць і эпізадычнасць даных, прадстаўленых у літаратуры 1920-х гг., яны не задаліся пытаннем, чаму яна, літаратура таго часу, так невыразная ў дадзеным выпадку. Нават больш невыразная, як у шэрагу іншых выпадкаў з арганізацыйнай гісторыі Інбелкульта. У выніку гісторыя статутнага афармлення дзейнасці такой знакавай установы, як Інстытут беларускай культуры, на працягу многіх дзесяцігоддзяў заставалася па-за ўвагай даследчыкаў і нейкага больш ці менш адэкватнага асэнсавання не атрымала, капіруючы асобныя згадкі арганізатараў навукова-арганізацыйных працэсаў таго часу. На гэтай глебе ва ўмовах паслясавецкага перыяду выкладчыкамі БДУ, галоўным чынам, створана зусім неаргументаваная, і ў выніку неадпаведная, карціна працэсу стварэння першага статуту ІБК.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. С. Н. Інстытут Беларускай Культуры / С. Н. // Адраджэньне. – 1922. – Сш. 1. – С. 278–282.

2. Няміга, Г. Інстытут беларускай культуры – Беларуская Акадэмія навук – Акадэмія навук Беларускай ССР / Г. Няміга. – Мюнхен, 1957. – 162 с.

3. Інстытут беларускай культуры / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.

4. Іофе, Э. Р. Першыя крокі / Э. Р. Іофе // Полымя. – 1972. – № 2. – С. 205–209.

5. Міхнюк, У. М. Інстытут беларускай культуры / У. М. Міхнюк // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1979. – № 1. – С. 21–30.

6. Інстытут Беларускай культуры (Інбелкульт) // Беларусь : энцыкл. давед. ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1995. – С. 347–348.

7. Міхнюк, У. Інстытут беларускай культуры / У. Міхнюк // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2003. – Т. 3. – 1996. – С. 490–491.

8. Баранова, Е. В. Владимир Иванович Пичета в научно-образовательных и общественно-политических процессах Беларуси (1918–1930 гг.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Е. В. Баранова. – Минск, 2008. – 144 л.

9. Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт). Гісторыя ўзьнікненьня. Сучасная структура. Навукова-дасьледчая дзейнасьць / апрацаваў А. І. Цьвікевіч. – Менск : ДВБ, 1926. – 118 с.

10. Шпилевский, И. Ф. Белорусская Академия наук на пороге второй пятилетки : ист. очерк / И. Ф. Шпилевский, Л. А. Бобрович. – Минск, 1933. – 112 с.

11. Палуян, У. А. Інстытут беларускай культуры і станаўленне беларускай савецкай навукі / У. А. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1972. – № 6. – С. 104–111.

12. Бандарчык, В. К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі / В. К. Бандарчык ; рэд. А. И. Жураўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 168 с.

13. Беларусы : у 8 т. / В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2009. – Т. 3 : Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык. – 1999. – 365 с.

14. Академия наук Белорусской ССР / Н. И Голенчик [и др.] ; редкол.: Н. А. Борисевич (пред.) [и др.]. – Минск : Гл. ред. Белорус. Совет. Энцикл., 1979. – 600 с.

15. Академик В. И. Пичета. Страницы жизни. – Минск : Изд-во БГУ, 1981. – 126 с.

16. Баранова, Е. В. В. И. Пичета: белорусское обрамление исторического портрета (к 130-летию со дня рождения) / Е. В. Баранова, О. А. Яновский // Российские и славянские исследования : науч. сб. / Белорус. гос. ун-т. ; А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – Вып. 3. – С. 219–232.

17. Яновский, О. А. Владимир Иванович Пичета. 09.10.1878 – 23.06.1947 / О. А. Яновский // Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941): 100 лет университетскому образованию и науке в Беларуси / С. В. Абламейко [и др.] ; науч. ред. О. А. Яновский. – Минск : БГУ, 2017. – С. 23–41.

18. Яновский, О. А. «Революция пришла, она меня захватила…». Два текста, объединенные одной судьбой / О. А. Яновский // Беларус. думка. – 2011. – № 10. – С. 54–64.

19. Іофе, Э. Партрэт вучонага / Э. Іофе // Полымя. – 1970. – № 12. – С. 215–221.

20. Іофе, Э. Р. Першы рэктар / Э. Р. Іофе // Маладосць. – 1971. – № 10. – С. 124–127.

21. Иоффе, Э. Г. Владимир Иванович Пичета / Э. Г. Иоффе // Портреты историков. Время и судьбы : в 2 т. – М. ; Иерусалим : Университет. книга, 2000. – Т. 1 : Отечественная история. – С. 177–191.

22. Іофе, Э. Р. Удзел У. І. Пічэты ў стварэнні і дзейнасці Інстытута беларускай культуры / Э. Р. Іофе // Інстытут беларускай культуры: здабыткі, значэнне, вынікі дзейнасці : матэрыялы Міжнар. круглага стала, прысвеч. 95-годдзю Інстытута беларускай культуры, Мінск, 10 ліст. 2017 г. / Цэнтр дaслед. бел. культуры, мовы і літ. Нац. акад. навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – С. 11–20.

23. Шаўчук, І. І. Стварэнне Інстытута беларускай культуры (да 80-годдзя) / І. І. Шаўчук // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2002. – № 1. – С. 24–29.

24. Шаўчук, І. Арганізацыя навукі Беларусі ў пачатку 20-х гадоў / І. Шаўчук // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 8. – С. 15–20.

25. Шаўчук, І. І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.) / І. І. Шаўчук. – Брэст : БрДУ, 2007. – 279 с.

26. Ігнатоўскі, У. Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12. – С. 10–27.

27. Інстытут беларускай культуры. 1922–1928 : дакументы і матэрыялы / В. У. Скалабан, М. У. Токараў. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 19.

28. Токарев, Н. В. Как создавался Инбелкульт / Н. В. Токарев // Навіны Беларус. Акад. – 1992. – 21 лют. – С. 5.

29. Ёфэ, Э. Р. Ад Інстытута беларускай культуры да нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Малавядомыя старонкі // Наука и инновации. – 2018. – № 8. – С. 4–10.

30. Пічэта У. І. Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым / У. І. Пічэта. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 48 с.

31. Институт белорусской культуры // Звезда. – 1921. – 23 апр. – С. 4.

32. Ходин, С. Объединяя прошлое, настоящее и будущее / С. Ходин, О. Яновский // Беларус. думка. – 2016. – № 10. – С. 12–20.

33. Абламейко, С. В. БГУ – основа белорусской науки и высшего образования / С. В. Абламейко // Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941): 100 лет университетскому образованию и науке в Беларуси / С. В. Абламейко [и др.] ; науч. ред. О. А. Яновский. – Минск : БГУ, 2017. – С. 8–21.

34. Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / склад. А. А. Яноўскі. – Мінск : БДУ, 2001. – 339 с.

35. Турук, Ф. Университетская летопись / Ф. Турук // Тр. Белорус. гос. ун-та в Минске. – 1922. – № 1. – С. 175–207.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 17.10.2019

***Shauchuk I. I.*** **Inbelcult Statutes: The Origins of Current Notions**

*There are presented in the paper the results of a historographic study of the comprehension of one of the fragments of the Institute of Belarusian Culture (IBC) history, namely the normative shaping of its activities, reflected in the statutes. The process of creating the first statute of the IBC in 1921 is examined. In this case the lack of attention to the problem in the national historical science is revealed. The sources of the same episodic statement of the marked problem are established – nominal references to it in the literature of the interwar period. The conclusion is drawn about the incorrectness of the authors' assertions regarding the time of organization of creation as well as authorship of the first status (beginning of 1921, 1922. V. I. Picheta, BSU professors, numerous commissions). There is emphasized the lack of argumentation for such conclusions. At the same time an attempt was made to reconstruct the real events of that time.*